ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

***SCIENTISTS OF BELARUS***

# УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ ГНІЛАМЕДАЎ
**(Да 85-годдзя з дня нараджэння)**



26 снежня 2022 г. споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага літаратуразнаўцы і літаратурнага крытыка, акадэміка, доктара філалагічных навук, прафесара, таленавітага, самабытнага беларускага празаіка, галоўнага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Васільевіча Гніламедава.

Нарадзіўся У. В. Гніламедаў у в. Кругель (цяпер Камянецкі раён Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. У 1954 г. скончыў Кругельскую сярэднюю школу і паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Пасля заканчэння педінстытута працаваў завучам Тамашоўскага дзіцячага дома і адначасова настаўнікам беларускай і рускай мовы і літаратуры Тамашоўскай сямігодкі Брэсцкага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1959–1961), некаторы час настаўнічаў у Камароўскай сярэдняй школе на Брэстчыне, вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры АН БССР (1962–1965). У 1966 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную даследаванню праблемы традыцый і наватарства ў беларускай літаратуры 1950–1960-х гг., у 1987 г. – доктарскую дысертацыю на тэму «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс».

Уладзімір Васільевіч Гніламедаў фактычна ўсё сваё жыццё займаў адказныя кіруючыя пасады: з 1969 па 1976 г. ён працаваў спачатку інструктарам, а затым загадчыкам сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ, адказваў за работу Саюза пісьменнікаў Беларусі, курыраваў літаратурна-мастацкі працэс рэспублікі, з 1977 па 1999 г., перайшоўшы на работу ў сістэму Акадэміі навук, працаваў загадчыкам аддзела тэорыі літаратуры Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі, з 1976 па 1997 г. – намеснікам дырэктара гэтага інстытута па навуковай рабоце і з 1997 па 2006 г. – яго дырэктарам.

У сваіх літаратуразнаўчых работах першага, падсавецкага, перыяду У. В. Гніламедаў засяродзіў сваю ўвагу на важнейшых праблемах развіцця літаратуры і мастацтва – гісторыя і сучаснасць, традыцыі і наватарства, творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс. Манаграфіі вучонага былі звернуты да выяўлення асноватворнага: з чаго нараджаюцца вершы, як узнікае паэзія, што абумоўлівае яе развіццё? У аснову асноў ён паставіў аўтара, асобу творцы з яе душою, свядомасцю, характарам светаадчування і тыпам мыслення, а ў выніку – індывідуальным почыркам, стылявой манерай, мастацкім стылем як першаасновай яго мастацкай своеадметнасці.

Кнігі У. В. Гніламедава «Традыцыі і наватарства» (1972), «Як само жыццё» (1980), «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» (1983) і іншыя заключалі ў сабе выразны індывідуальны код мыслення, мелі наватарскі характар. Адным з першых у тагачасным савецкім літаратуразнаўстве аўтар адмовіўся ад распаўсюджанага дагэтуль агляднага, нарысавага падыходу, а таксама біяграфічнага, жанравага аналізу літаратурна-мастацкіх з'яў і працэсаў. У аснову вывучэння сучаснай беларускай паэзіі і шырэй – літаратуры ён паклаў прынцып гістарызму і эвалюцыйнага развіцця, якое засноўваецца на вопыце гістарычнага мінулага, на традыцыі нацыянальнага прыгожага пісьменства. Сучаснасць, на думку даследчыка,

абавязкова ўбірае ў сябе гістарычнае мінулае, яна не можа існаваць без сувязі эпох, пакаленняў, пераемнасці чалавечага вопыту і традыцый. Разгляд сучаснай беларускай паэзіі У. В. Гніламедаў пачаў з вытокаў, з глыбокай старажытнасці; ён засяродзіўся на праблеме пераемнасці ідэйна-эстэтычных набыткаў папярэдніх пакаленняў творцаў, дыялектычным узаемадзеянні мастацкіх дасягненняў мінулага і новых адкрыццяў, спалучэнні традыцый і наватарства. Яго манаграфія «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» з'явілася адной з лепшых у беларускай гуманітарнай навуцы другой паловы XX стагоддзя. Аналізуючы пошукі і дасягненні канкрэтных творчых індывідуальнасцей у іх развіцці і ўзаемадзеянні, крытык выяўляў дынаміку ўсяго літаратурна-мастацкага працэсу, які, у сваю чаргу, добра высвечваў характар, спецыфіку, месца і ролю ў ім саміх гэтых творчых індывідуальнасцей.

Намеснікам дырэктара Інстытута літаратуры Уладзімір Васільевіч быў тады, калі яго ўзначальвалі такія вядомыя і аўтарытэтныя ў нашай навуцы і культуры асобы, як акадэмікі і пісьменнікі І. Я. Навуменка і В. А. Каваленка. Працуючы дырэктарам, ён здолеў паспяхова прадоўжыць традыцыі сваіх выдатных папярэднікаў, забяспечыў далейшае развіццё ўстановы, актывізацыю пошукаў акадэмічнага літаратуразнаўства па ўсіх актуальных навуковых напрамках.

Пад кіраўніцтвам акадэміка У. В. Гніламедава і пры яго непасрэдным удзеле ажыццяўляліся, дарэчы, на аснове новых тэарэтыка-метадалагічных прынцыпаў і каштоўнасцей і з улікам усяго магчымага спектра фактычных даных такія фундаментальныя праекты, як «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 4 тамах 6 кнігах, «Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў» у 2 тамах, «Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя», вялася распрацоўка Збору твораў Янкі Купалы ў 9 тамах, Збору твораў Якуба Коласа ў 20 тамах, Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах, шматлікіх манаграфічных выданняў і інш.

Уладзіміру Васільевічу, як мала каму іншаму з беларускіх літаратуразнаўцаў, не было асаблівай патрэбы перабудоўвацца ў часы вядомай ломкі духоўна-сацыяльных каштоўнасцей сярэдзіны 1980-х гг., яго методыка навуковага аналізу засталася ранейшай і ў працах 1990-х гг., і ў новым стагоддзі. У яе аснове – прынцып гістарызму, пераемнасці вопыту і традыцый, пільная ўвага да асобы самога творцы з усім багаццем і разнастайнасцю яе духоўна-псіхалагічнага свету думак і перажыванняў, суаднясенне творчай індывідуальнасці і літаратурна-мастацкага працэсу. У адной з нашых нядаўніх гутарак даследчык прызнаваўся, што ў навуковых работах "заўсёды імкнуўся спалучаць гістарычнае з тэарэтычным, пранікнуць у абсягі эстэтычнага аналізу, паказаць адметнасць вобразнасці, вабнасць, прыгажосць, рэльеф мастацкага твора з тым, каб можна было палюбавацца той духоўна-эстэтычнай рэальнасцю, якая складае яго змест".

Усё гэта і многае іншае добра засведчылі кнігі новага, постсавецкага, перыяду: «Праўда зерня: творчы партрэт Васіля Зуёнка» (1992), «Янка Купала: новы погляд» (1995), «Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію» (2001), «Янка Купала: жыццё і творчасць» (2012), «На рубеже времен: русскоязычная поэзия Беларуси» (2013) і іншыя, якія замацавалі за У. В. Гніламедавым статус лідара сучаснага беларускага літаратуразнаўства.

Фундаментальнае манаграфічнае даследаванне У. В. Гніламедава (з нашым аўтарскім удзелам) «Літаратура. Гісторыя. Свядомасць: гісторыка-літаратурны нарыс» (2017) прысвечана выяўленню і аналізу вызначальных праблем нацыянальнай літаратуры ў цеснай сувязі з вядучымі парадыгмамі сацыяльна-гістарычнага развіцця і працэсам фарміравання нацыянальнай свядомасці беларускага народа. У ім на багатым і разнастайным фактычным матэрыяле па-новаму, у сучаснай «оптыцы», з улікам апошніх дасягненняў айчыннай і еўрапейскіх школ і методык літаратуразнаўчага даследавання асвятляюцца шматлікія з'явы і падзеі далёкага і нядаўняга нацыянальнага мінулага (ад першапраходцаў і пачынальнікаў Е. Полацкай, К. Тураўскага і Ф. Скарыны да класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і М. Гарэцкага, а ад іх да М. Танка, В. Быкава, І. Мележа, І. Шамякіна, У. Караткевіча, А. Разанава і інш.), а таксама навейшай літаратурнай гісторыі Беларусі. Жанр навукова-філасофскага эсэ ўдала абумовіў выяўленне багацця і разнастайнасці крыніц і матэрыялаў, дыялектычны сінтэз канкрэтна-гістарычнага прэпаравання мастацкіх тэкстаў і маштабных сацыякультурных абагульненняў у тлумачэнні з'яў і фактаў гісторыка-літаратурнага працэсу, раскаванасць аўтарскага апавядання.

Жыццё і творчасць буйнейшых беларускіх майстроў слова разглядаюцца ў манаграфіі ў суаднесенасці з асноўным напрамкам гістарычнага развіцця, уключаюцца ў агульны культурнагістарычны і грамадска-палітычны кантэкст эпохі.

Вялікім дасягненнем У. В. Гніламедава з'яўляецца тое, што ён першым у айчыннай навуцы аднавіў даследаванне рускамоўнай літаратуры Беларусі, фактычна рэаніміраваўшы гэты напрамак беларускага літаратуразнаўства.

У 2019 г. пабачыла свет своеадметнае, арыгінальнае, шмат у чым наватарскае выданне «Поэзия русского слова: антология современной русскоязычной поэзии Беларуси» ў 2 тамах, ажыццёўленае пад навуковым кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле У. В. Гніламедава. У ім у выніку глыбокага комплекснага аналізу канкрэтных мастацкіх твораў, паэтычных зборнікаў і творчых індывідуальнасцей упершыню ў гуманітарыстыцы і культуры распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы і канцэптуальныя асновы анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі як ідэйнамастацкай сістэмы, ажыццёўлены сюжэталагічная эндаскапія і структурна-кампазіцыйная парадыгма анталогіі, раскрыты ідэйна-эстэтычная спецыфіка і грамадска-культурны феномен сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі.

У фундаментальнай калектыўнай манаграфіі "Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія" (2021), падрыхтаванай таксама пад навуковым кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле акадэміка У. В. Гніламедава, выяўлены канцэптуальныя асновы нацыянальных тыпаў ментальнасці, раскрыта ідэйна-мастацкая спецыфіка духоўна-нацыянальнай ментальнасці і канцэптасферы ў беларускай і шэрагу еўрапейскіх літаратур як дамінантнага кампанента ў структуры нацыянальных культур, паказана ідэйна-эстэтычная своеасаблівасць «чужога», «іншага» (паводле этнічнай, сацыякультурнай і моўнай прыналежнасці) у творах беларускай, рускай, украінскай, польскай, англійскай, іспанскай і іншых літаратур, вызначана мастацкая прырода этнаміфаў і этнастэрэатыпаў у адлюстраванні нацыянальнага свету рэчаіснасці, характару іх уплыву на псіхалогію асобы і грамадскую свядомасць, прааналізаваны ўстойлівыя модульныя кампаненты генетычных кантактаў і тыпалагічных сыходжанняў мастацкай парадыгмы беларускай і еўрапейскай літаратур.

У. В. Гніламедаў з'яўляецца галоўным тэарэтыкам і філосафам у сучаснай беларускай навуцы пра літаратуру, галоўным знаўцам творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Васіля Зуёнка, Міколы Мятліцкага, без перабольшання – усёй сучаснай беларускай паэзіі, а таксама літаратуры беларускага замежжа, у прыватнасці, беларускай літаратуры ў Польшчы і інш.

Усяго акадэмік У. В. Гніламедаў апублікаваў больш за 1000 навуковых работ, у тым ліку каля 30 манаграфій і кніжных выданняў.

Манаграфіі і кніжныя выданні вучонага з'яўляюцца фундаментальнымі даследаваннямі праблем развіцця беларускага прыгожага пісьменства XI–XXI стст. У іх шырока і ўсебакова раскрыты складаны, супярэчлівы айчынны літаратурна-мастацкі працэс, пераемна звязаны з перадавымі ідэйна-эстэтычнымі традыцыямі рускай, польскай, украінскай і іншых нацыянальных літаратур і культур.

Упершыню ў гуманітарнай навуцы і культуры беларуская паэзія вывучана акадэмікам У. В. Гніламедавым адначасова праблемна-тэарэтычна і ў багацці гісторыка-генетычных сувязей, у шырокім дыяпазоне індывідуальна непаўторных праяў і дынаміцы агульных тэндэнцый і заканамернасцей. Сучасная беларуская паэзія падрабязна даследавана вучоным перш за ўсё ў найноўшых ідэйна-мастацкіх пошуках, паглыбленні асобаснага пачатку, складванні і развіцці ў ёй стылявых плыней, у рухомым працэсе тыпаў вершаскладання, плённым узаемадзеянні са славянскім светам мастацкай творчасці і культуры.

Унікальнай з'явай на этапе навейшай літаратурнай гісторыі Беларусі стала знакамітая раманная хроніка У. В. Гніламедава. Раманы пісьменніка «Уліс з Прускі» (2006), «Расія» (2007), «Вяртанне» (2008), «Валошкі на мяжы» (2014), «Вайна» (2014), «Пасля вайны» (2021), «Праўда жыве пасярэдзіне» (2022) і іншыя (усяго 9 шырокафарматных палотнаў) заключаюць у сабе якасці

і характарыстыкі вялікага нацыянальнага эпасу, параўнальнага з серыямі класічных раманаў Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, І. Мележа, І. Шамякіна, У. Караткевіча і інш. У іх глыбока і ўсебакова выяўлена гісторыя жыццядзейнасці беларускага народа на этапах самага складанага і супярэчлівага ХХ ст.

Раманная хроніка У. В. Гніламедава ўражвае шырынёй ахопу грамадска-сацыяльных працэсаў і ў той жа час увагай да прыватнай канкрэтыкі з'яў і фактаў народнага жыцця, праблемна-тэматычным багаццем і разнастайнасцю зместу. Пісьменнік раскрыў асаблівасці вялікага беларускага нацыянальнага свету з цэнтрам у вёсцы Пруска, у якім усё прасякнута глыбіннай унутранай логікай і высокім сэнсатворным пачаткам, знаходзіцца ва ўзаемазвязанасці і ўзаемаабумоўленасці дэталей і кампанентаў, малога і вялікага, у суладнасці і гармоніі зместу і формы, функцыянуе ў адпаведнасці з даўно ўсталяванымі і адладжанымі прынцыпамі і законамі.

Тыповае для беларускага мастацкага эпасу хранікальна-падзейнае адлюстраванне рэчаіснасці спалучаецца ў У. В. Гніламедава з філасофска-заглыбленым асэнсаваннем жыцця і чалавека, тонкімі лірычнымі замалёўкамі і відарысамі. У выніку з-пад пяра пісьменніка паўстае жывы летапіс часу, жывая гісторыя эпохі ва ўсёй яе дынаміцы складаных грамадска-сацыяльных супярэчнасцей і канфліктаў, змен і зрухаў.

Навуковая і творчая дзейнасць Уладзіміра Васільевіча Гніламедава атрымала высокую ацэнку грамадскасці і дзяржавы. Ён – акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2003), доктар філалагічных навук (1987), прафесар (1991), лаўрэат Літаратурнай прэміі імя У. Калесніка Саюза пісьменнікаў Беларусі (1996), лаўрэат прэміі НАН Беларусі (2005), лаўрэат Літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2006), лаўрэат прэміі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў імя Чынгіза Айтматава (2020), лаўрэат Спецыяльнай прэміі Старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2022), кавалер ордэна Францыска Скарыны (2009), заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (2017).

Сардэчна віншуем Вас, шаноўны Уладзімір Васільевіч, з юбілеем!

Бюро Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, а таксама вучоная грамадскасць жадаюць Вам новых цікавых, глыбокіх кніг на спажытак шматлікіх удзячных чытачоў!

*Бюро Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*сябры і калегі, вучоная грамадскасць*